Падтрымай "Вясну" на PATREON

Леанід Кулакоў пакараны арыштам на 10 сутак за салідарнасць з Юрыем Рубцовым

23.06.2015 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Леанід Кулакоў

Адміністратыўная справа актывіста ««Еўрапейскай Беларусі» Леаніда Кулакова разгледжаная ў судзе Мінскага раёна 23 чэрвеня. Ён быў затрыманы яшчэ ў пятніцу, разам з Максімам Вінярскім і Сяргеем Мацкойцем, нібыта за вывешванне расцяжкі ў падтрымку палітвязня Юрыя Рубцова. Затрыманне

адбылося ў лесапаласе каля гіпермаркета “ГІППА”, прычым затрымлівала актывістаў, па словах Максіма Вінярскага, каля 16 супрацоўнікаў АМАПу.

22 чэрвеня Вінярскі і Мацкойць былі пакараныя арыштам на 10 і 5 сутак адпаведна па артыкуле 23.34 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў).

А справу ў дачыненні да Леаніда Кулакова перанеслі на наступны дзень, паколькі на суд не з’явіліся сведкі - супрацоўнікі міліцыі. Да суду яго адпусцілі дадому.

Суддзя **С. Ткачук** прызнаў Леаніда Кулакова вінаватым у правядзенні несанкцыянаванага пікета і пакараў арыштам на 10 сутак. Пасля вынясення рашэння Кулакова не адправілі адбываць арышт, а яму паведамілі, што ўсе ягоныя дакументы перададзеныя ва УУС Першамайскага раёна Мінска, якое і будзе выконваць судовае рашэнне. Актывіст мае намер абскардзіць рашэнне суд Мінскага раёна.

Твитнуть







Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023


ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY